*УДК 821.161.3-1/-3*А.Федарэнка*
**Р. А. Прахарэнка**
***Навук. кір. – Т. А. Фіцнер, канд. філал. навук, дацэнт***

# УВАСАБЛЕННЕ ІНТЫМНАЙ ТЭМАТЫКІ Ў ТВОРАХ АНДРЭЯ ФЕДАРЭНКІ

*У артыкуле разглядаюцца праявы інтымнага ў творах А. Федарэнкі, аналізуюцца спосабы адлюстравання інтымнай тэматыкі. Разгледжаны тыпы кахання, пададзеныя ў творах аўтара. Звярнута ўвага на асаблівасці псіхасексуальных узаемаадносін паміж героямі твораў.*

Інтымная тэматыка прысутнічае ў творчай спадчыне практычна кожнага айчыннага аўтара. Гэта абумоўлена не толькі асабістым жыццѐвым вопытам пісьменнікаў, іх перажываннямі, але і высокай папулярнасцю інтымных твораў. Часцей за ўсѐ гэта лірычныя творы. Інтымная лірыка, на думку А. В. Брадзіхінай «мае найбольшыя патэнцыі эмацыянальна-пачуццѐвага ўздзеяння на чалавечую свядомасць, бо суадносіцца з жыццѐвым вопытам і ўнутранымі перажываннямі амаль кожнай асобы» [1, с. 6]. Прыкладаў інтымнай беларускай лірыкі незлічонае мноства. У старажытнабеларускай



літаратуры гэта польскамоўныя вершы С. Полацкага, у XIX стагоддзі санеты А. Міцкевіча, балады Я. Баршчэўскага і Я. Чачота. Таксама інтымная тэматыка адлюстравана ў лірыцы пісьменнікаў пачатку XX стагоддзя (З. Бядуля, К. Буйло, А. Гурыновіч). Увогуле, лірыка інтымнага характару даследавана вельмі дакладна і з розных бакоў. А што наконт прозы? Разгледзім некаторыя творы празаіка

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| з Мазыршчыны | Андрэя | Федарэнкі, | творчасць | якога Міхась | высока Тычына |
| ацэньваюць | айчынныя | літаратуразнаўцы. | Так, | | |
| зазначае: «Мне здаецца, што Андрэй Федарэнка натуральным чынам увайшоў у шэраг | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| беларускіх класікаў, у лік тых, каго мы прывыклі так | | | | | | |
| называць. | Жывых | літаратараў | рэдка | так | называюць, | аднак |

А. Федарэнку можна лічыць класікам, які жыве і шмат працуе ў адзін з намі час. І тое, што ѐн робіць, выклікае ўвагу і павагу» [2].

Многія творы А. Федарэнкі ў сваѐй аснове аўтабіяграфічныя. Гэта і аповесці «Гісторыя хваробы», «Вѐска», эсэ «З кошыкам, або Гісторыя ненапісанай аповесці», раман «Рэвізія». І ўсѐ ж названыя творы – гэта не літаральны жыццяпіс пісьменніка, у іх перавагу мае мастацкі вымысел.

Для нас цікавасць прадстаўляюць праявы інтымнага ў прозе А. Федарэнкі. І гэтыя праявы досыць разнастайныя.

У аповесці «Вѐска» яскрава выявілася любоў галоўнага героя Антона Васкевіча да сваѐй малой Радзімы, прыезд на якую павінен быў дапамагчы разабрацца з праблемамі, што зваліліся на плечы маладога чалавека. Праходзіць час, але знаходжанне ў вѐсцы не апраўдвае чаканні: хлопец пачынае піць, гуляць, спрабуе нават спакусіць дзяўчынку-падлетка – гэта дэталі, якія маюць свой мясцовы каларыт, але ніяк не ўпісваюцца ва ўяўленні пра краіну дзяцінства як лепшага месца на зямлі. Так думаў і сам А. Федарэнка, які падлеткам сумаваў, што нарадзіўся не ў горадзе. Нягледзячы на тое непрывабнае, што ѐсць у жыцці вѐскі, яна з цягам часу стане самым дарагім месцам для Антона Васкевіча.

Напісаная ў 1989 г. «Гісторыя хваробы» зрабіла А. Федарэнку знакамітым сярод маладых беларускіх аўтараў. Кніга пачынаецца з апісання новага вучэбнага года і абмеркавання актуальнай для студэнтаў новай сістэмы адзнак. Звычайныя студэнцкія будні ідуць як заўсѐды, за выключэннем ціхіх абмеркаванняў смерці аднаго студэнта. Як ні дзіўна, плѐтак, што звычайна суправаджалі такія гісторыі, не было, толькі розныя трактаванні абставінаў яго смерці. Сусед па пакоі Вяргейчыка Брусавец просіць расшыфраваць дзѐннік нашага героя Васкевіча, ад асобы якога ідзе аповед. Адметна тое, што сам дзѐннік напісаны беларускаю лацінкаю, дакладней самая апошняя



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і цікавая яго частка. Ад Васкевіча мы даведваемся аб тым, якім пры жыцці быў Вяргейчык. «Ёсць людзі, якія да таго звыкаюцца з выдуманым імі ж крыжам, які яны быццам бы цягнуць на сваю Галгофу, што адчуваюць у гэтым нават асалоду. І прапануй толькі – так, дзеля смеху, скажы: «Табе памагчы?» – з якім гонарам твая «помач» будзе адрынутая!» [3, с. 3]. Асабісты дзѐннік героя, арганічна ўведзены аўтарам у сюжэт, спрыяе інтымнай спавядальнасці апавядання. Васкевіч, які спачатку разам з Вяргейчыкам займаўся распаўсюджваннем і папулярызацыяй беларушчыны, расчараваўся ў гэтай ідэі. З таго часу і кантактавалі яны мала. І вось цяпер наш герой займаецца расшыфроўкай дзѐнніка свайго былога таварыша: «Я расклаў неадпраўленыя лісты не па датах напісання, а згодна зместу дзѐнніка – і вось, што выйшла» [3, с. 5]. З гэтага моманту і пачынаецца паступовае знаѐмства з гісторыяй Валодзі Вяргейчыка, гісторыяй яго кахання, ці гісторыяй хваробы, як адзначае сам нябожчык у дзѐнніку.

На самым пачатку мы бачым Вяргейчыка як чалавека неардынарнага, дзейснага. У інстытуце хлопец займаўся паэзіяй, быў студэнтам з ужо абуджанай нацыянальнай свядомасцю, моцна перажываў за адраджэнне беларускай мовы і культуры роднага краю. Малады студэнт прымае ўдзел у справе беларушчыны, становіцца сапраўдным лідарам. Пад кіраўніцтвам Вяргейчыка студэнты праводзяць агітацыю за беларускія класы, ствараюць суполку «Раніца». Паступова энергія маладога чалавека згасае. І як гэта не дзіўна, хвароба Вяргейчыка пачалася са звычайнай зайздрасці. Чалавек, які цікавіўся толькі справай адраджэння нацыянальнага, пасля аповеду свайго знаѐмага аб праведзенай ім ночы з дзяўчынай, пачаў яму зайздросціць: «Помніш, паўгода назад ты прыязджаў у Мінск і начаваў у Тані? Каб ты толькі ведаў, чым я цяпер заплаціў бы, каб раніцой ты не заходзіў тады да мяне! Можа, калі б я не ведаў падрабязнасцей той ночы, нічога цяпер са мной не было б. Вы – ты і Таня –
былі мне як брат з сястрою. Нас яднала адна справа, і бажуся, што мне ў галаву не ўлазіла, як гэта проста робіцца – пагаварыўшы з жанчынаю аб высокіх матэрыях, класціся з ѐю ў ложак і рабіць тое, пра што ты тады мне расказваў. Пасля твайго аповеду ў мяне знікла галоўнае, вера, што на зямлі ѐсць нешта святое, бо наша справа была для мяне адзіным, чым я жыў пасля войска» [3, с. 5].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пачуццѐ да пяцікурсніцы Тані Мяцельскай цалкам паглынае хлопца, вырывае з актыўнага жыцця. Валодзя з-за бясконцых думак пра дзяўчыну становіцца напаўвар'ятам. Але ўзаемнасці ад Таццяны хлопец не дачакаўся, дзяўчына не змагла прыняць яго як партнѐра.

Менавіта па гэтай прычыне Вяргейчык адчувае сябе непаўнавартасным, абдзеленым. У яго душы разгараецца вялікае жаданне перамагчы гэтае пачуццѐ і дабіцца блізкасці з дзяўчынай. Малады чалавек губляецца ў рэальнасці, замыкаецца на праблеме ўзаемаадносін з той, кім ѐн апантаны.
Адносіны паміж Вяргейчыкам і Мятліцкай нагадваюць адзін з тыпаў кахання, ахарактарызаваны яшчэ старажытнымі грэкамі – манію. Такі від кахання, па словах А. В. Брадзіхінай, «грэкі інтэрпрэтуюць як каханне-апантанасць, блізкае да шаленства, што характарызуецца няўпэўненасцю і залежнасцю ад абранага аб'екта пачуцця» [1, с. 30]. З-за сваѐй закамплексаванасці хлопец не чуе ні сябе, ні акаляючых яго людзей. Менавіта таму маладога чалавека цягне ў бездань смерці, ѐн адчувае наканаванасць смерці, сустракае яе ў адзіноце, звыкнуўшыся з лѐсам тых, хто заўчасна пайшоў на той свет: «Паміраюць малыя дзеці, дзяўчынкі ў семнаццаць гадоў, гінуць, забіваюцца хлопцы, якіх ні разу не цалавалі. Я гэта ведаю і мяркую, што прырода ці Бог у выпадку са мною не робяць злачынства. Але мне горка, часам жахліва. Я быццам патрапіў у дрыгву, якая марудна цягне ўніз» [3, с. 17 ]. Вытокі ўнутранай драмы Валодзі Вяргейчыка глыбока інтымныя, заснаваныя на псіхасексуальных перажываннях. «Гісторыя хваробы» – гэта не проста хроніка ўзлѐту і падзення духу маладога чалавека, а ў пэўнай ступені партрэт некаторай часткі прадстаўнікоў сучаснай моладзі.
Яшчэ адзін від кахання А. Федарэнка адлюстраваў у апавяданні «Аднакласнік». Аднакласнік распавѐў пра адносіны са сваѐй першай дзяўчынай, якую ѐн купіў. Менавіта блізкасць з дзяўчынай была тым коштам, што прызначыў малады чалавек за дапамогу ѐй у напісанні курсавога праекта. Пасля праведзенай разам ночы хлопец нават перастаў вітацца з дзяўчынай. А праз некаторы час у героя пачала адсыхаць нага. Аўтар увѐў элемент цуду наўмысна, каб паказаць, што такія адносіны да жанчыны павінны быць пакараны, што каханне – гэта святое. Хлопец атрымаў свой урок і нават пераасэнсаваў свае паводзіны: «Увогуле, каханне жанчыны, калі ўдумацца, – кажа ѐн, –
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гэта такая страшная загадка, такая тайна; ѐсць у тым, што жанчына ахвяруе сабою, аддае ўсю сябе чужому чалавеку, штосьці такое містычнае, незразумелае і нежартоўнае, што нельга гуляцца з гэтым. А я вось захацеў менавіта пагуляцца. І дагуляўся» [4, с. 164]. У гэтым творы мы назіраем каханне тыпу людус, якое грэкі характарызавалі як «каханне-гульню, якое мела на мэце дасягненне асалоды і не вылучалася глыбінѐй пачуццяў» [1, с. 30].



Падсумоўваючы, зазначым, што ў творах А. Федарэнкі адлюстраванне інтымнага вельмі featured рознабаковае: тут і любоў да Радзімы, і неўзаемнае каханне да жанчыны, і нават каханне-гульня. Пісьменнік мае ўласны погляд на сістэму кахання і любові і адметна адлюстроўвае гэтыя пачуцці ва ўласных творах.

**Спіс літаратуры**

1 Брадзіхіна, А. В. Сучасная беларуская інтымная лірыка: тэндэнцыі і перспектывы развіцця / А. В. Брадзіхіна. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2009. – 204 с.
2 Тычына, М. Андрэй Федарэнка ўвайшоў у шэраг беларускіх класікаў [Электронны рэсурс]. / М. Тычына – Рэжым доступу: http://budzma.by/news/mikhas-tychynaandrey-fyedarenka-wvayshow-u-sherahbyelaruskikh-klasikaw.html. – Дата доступу: 13.04.2022
3 Федарэнка, А. Гісторыя хваробы / А. Федарэнка. – Мінск : Выдавецтва ЦК КП Беларусі, 1989. – 111 с.
4 Федарэнка, А. М. Вѐска : аповесці, апавяданні / А. Федарэнка. – Мінск : Беларусь, 2013. – 349 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ